______________________________________________________________
(rajonas / miestas, mokykla)

______ klasės mokinio (-ės) ____________________________________
(vardas ir pavardė)

**2013 m. pagrindinio ugdymo pasiekimų patikrinimo užduotis**

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

## TEKSTO SUVOKIMAS IR LITERATŪROS ŽINIŲ TAIKYMAS
## KALBOS ŽINIŲ TAIKYMAS

Testas

**11 чэрвеня 2013 г.** **Час – 1 гадзіна**

**ТЛУМАЧЭННІ:**

- Праверце, ці няма пустых аркушаў ці іншых дэфектаў друку ў вашым тэксце. Калі заўважыце, паведамце настаўніку.
- Пісаць можаце і алоўкам, але канчатковы варыянт павінен быць напісаны ручкай сіняга колеру. Выкарыстоўваць карэктар забаронена.
- Будзе ацэньвацца і культура вашага пісьма: невыразна напісаныя, закрэсленыя адказы не будуць ацэнены (г.зн. за гэты адказ вы атрымаеце 0 балаў).
- На пытанні адказвайце коратка і зразумела. Вашы адказы павінны змясціцца ў адведзеных радках.

**VERTINIMAS**

| Užduotys | Maksimalus taškų skaičius | Surinktų taškų suma | | |
|---|---|---|---|---|
| | | 1 vertintojas | 2 vertintojas | 3 vertintojas |
| 1–7 | 16 | | | |
| 8–12 | 9 | | | |
| 13–17 | 15 | | | |
| Taškų suma | 40 | | | |
| Suapvalinta taškų suma | 40 | | | |
| | | | **Įvertinimas** | |

Vertinimo komisija: ______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

© Nacionalinis egzaminų centras, 2013

# ЗАДАННІ ПА РАЗУМЕННЮ ТЭКСТУ І ВЫКАРЫСТАННЮ ВЕДАЎ ПА ЛІТАРАТУРЫ

***(25 балаў)***

***Прачытайце верш і выканайце заданні 1–12.***

I Значыць, гэта не жарты,
Маці праўду сказала:
“Позна ўспомніў, на жаль, ты,
Сіняй пушчы не стала...”

II Сіняй пушчы не стала!
Хіба гэта магчыма?..
Сумна-шэрае гала
Ледзь акінеш вачыма.
Тут іграла калісьці
Неба шумна-вясёла.
А цяпер – абеліскі,
Пні-пянёчкі наўкола...

III Толькі воддаль на ветры
Дзве яліны крывыя,
Быццам могільнік гэты
Сцерагуць вартавыя.
Дзе ж ты дзелася, пушча?
У палац твой зялёны
І спякотай, і сцюжай
Я прыносіў паклоны.

IV Летам выбежыш рана,
Схопіш кошык лазовы
І ляціш, расхлістаны,
Пад знаёмыя сховы.
Тут усё нерухома.
Дакранешся да лапак –
І пакоціцца холад
За каўнер між лапатак.

V Ды і колюцца ж лапкі!
Толькі ты іх не чуеш:
Чарнамазыя бабкі
Асцярожна карчуеш.
Як жа ў засень ад сонца
Пахаваюцца росы,
Будзеш слухаць бясконцы
Гоман-спеў стогалосы.

VI Колькі іх тут, бывала,
Шумаў-гукаў лілося!
Колькі казак не стала!
Колькі песень звялося!
Колькі песень няспетых
Тут навек пахавана!
Колькі срэбрана-светлых
Ручаёў абарвана!..

VII У якія ж турботы
Я, зямляча, паверу?
Ці падумаў, на што ты
Апускаў тут сякеру?
Дзед твой спадчыну бацькі
Дзецям цэлай пакінуў.
Як жа мог ты пазбавіць
Гэтай спадчыны сына?

VIII Ганарыўся па праву
Продак пушчаю Сіняй.
Як жа мог ты пазбавіць
Гэтай гордасці сына?
А напэўна ж захочаш
Ты патомкам далёкім
Смела глянуць у вочы
З сэрцам чыстым і лёгкім?

IX Гэта права займееш,
Калі ў працы кіпучай
Кожны пень ты заменіш
Новай Сіняю пушчай.

***Заданні 1–12 (25 балаў)***

*Балы 1 2*

**1.** За што маці дакарае сына?

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

*(2 балы)*

**2.** Выпішыце **два** радкі, якія перадаюць пачуцці лірычнага героя, калі ён даведаўся, што пушчу знішчылі.

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

*(2 балы)*

**3.** Што нагадвае лірычнаму герою ссечаная пушча?

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

*(1 бал)*

**4.** Чаму “пні-пянёчкі” аўтар называе абеліскамі?

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

*(2 балы)*

**5.** Які настрой ствараюць ужытыя паэтам у апісані пушчы дзеясловы *выбежыш, схопіш, ляціш*?

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

*(2 балы)*

**6.** Што страчана са знікненнем Сіняй пушчы? *Адкажыце словамі з верша.*

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

*(3 балы)*

**7.** Выпішыце з верша **два** эпітэты і **дзве** метафары, якія перадаюць жаль, выкліканы знішчэннем пушчы.

Эпітэты: ..........................................................................................................

.......................................................................................................................

Метафары: .......................................................................................................

.......................................................................................................................

*(4 балы)*

| | | |
|---|---|---|
| Сума балаў за 1–7 заданні *(макс. 16 балаў)* | | |

*Балы*
*1 2*

**8.** Якая галоўная думка VII і VIII строф верша?

..........................................................................................................................

..........................................................................................................................

*(2 балы)* __ __

**9.** Чым, на думку аўтара, можна выправіць зло, нанесенае знішчэннем пушчы? *Адкажыце радкамі верша.*

..........................................................................................................................

..........................................................................................................................

..........................................................................................................................

..........................................................................................................................

*(1 бал)* __ __

**10.1.** Растлумачце значэнне слова *спадчына.*

..........................................................................................................................

..........................................................................................................................

*(1 бал)* __ __

**10.2.** Чаму аўтар верша лічыць пушчу спадчынай, якая павінна перадавацца з пакалення ў пакаленне?

..........................................................................................................................

..........................................................................................................................

..........................................................................................................................

..........................................................................................................................

*(2 балы)* __ __

**11.** Да якога віду лірыкі адносіцца гэты верш? *Правільны адказ абвядзіце.*

**А.** Грамадзянская

**Б.** Пейзажная

**В.** Інтымная

**Г.** Філасофская

*(1 бал)* __ __

**12.** Як вы разумееце сэнс выразу: “Любіць прыроду – значыць любіць Радзіму”?

..........................................................................................................................

..........................................................................................................................

..........................................................................................................................

..........................................................................................................................

..........................................................................................................................

*(2 балы)* __ __

| Сума балаў за 8–12 заданні *(макс. 9 балаў)* | | |
|---|---|---|

# ЗАДАННІ ПА ВЫКАРЫСТАННЮ ВЕДАЎ ПА МОВЕ
*(15 балаў)*

*Балы 1 2*

**13.** Выпішыце з верша адзін сказ з пабочным словам.

.....................................................................................................................

.....................................................................................................................

*(1 бал)* __ __

**14.** Растлумачце, чаму наступныя словы пішуцца праз злучок, і запішыце па аднаму прыкладу на гэтае ж правіла.

*Узор:*

*кілават-гадзіна – абазначае адзінку вымярэння ( чалавека-дзень)*

сумна-шэрае .....................................................................................

.....................................................................................................................

срэбрана-светлых .............................................................................

.....................................................................................................................

пні-пянёчкі ........................................................................................

.....................................................................................................................

*(6 балаў)* __ __

**15.** Напішыце, якія фанетычныя асаблівасці беларускай мовы выяўляюцца ў наступных словах:

маці – ..........................................................................................

воблакі – ......................................................................................

воддаль – .....................................................................................

праўду – ......................................................................................

дзве – ..........................................................................................

чыстым – .....................................................................................

*(6 балаў)* __ __

**16.** Выпішыце антанімічную пару з III страфы верша.

.....................................................................................................................

*(1 бал)* __ __

**17.** Растлумачце значэнне слова *сховы* ў словазлучэнні *пад знаёмыя сховы* (IV страфа).

.....................................................................................................................

.....................................................................................................................

*(1 бал)* __ __

| Сума балаў за 13–17 заданні *(макс. 15 балаў)* | | |
|---|---|---|

## Чарнавік